ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ, ПРАФКОМА І МЯСЦКОМА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 22 (155) | Субота, 16 чэрвеня 1973 г. | Год выдання 4-ты | Цана 2 кап.

## ЗАЎТРА—17 ЧЭРВЕНЯ—ДЗЕНЬ ВЫБАРАЎ У МЯСЦОВЫЯ САВЕТЫ



Гэты здымак быў зроблен на агітпункце выбарчага ўчастка № 13. Сюды часта завітвалі выбаршчыкі, каб азнаёміцца з літаратурай аб савецкай выбарчай сістэме, высветліць многія іншыя пытанні.

Вы бачыце агітатараў падрыхтоўчага аддзялення універсітэта, якія напярэдадні выбараў прыйшлі на агітпункт, каб зверыць спісы выбаршчыкаў.

**ТАВАРЫШЫ! УСЕ, ЯК АДЗІН, ДРУЖНА І АРГАНІЗАВАНА ПРЫЙДЗЕМ НА ВЫБАРЧЫЯ УЧАСТКІ, КАБ АДДАЦЬ ГАЛАСЫ ЗА ВЕРНЫХ СЫНОЎ СВАЙГО НАРОДА, ПРАДСТАЎНІКОЎ НЕПАРУШНАГА БЛОКУ КАМУНІСТАЎ І БЕСПАРТЫЙНЫХ!**

### НА ВЫБАРЧЫМ УЧАСТКУ № 11

за кандыдатаў у дэпутаты, якія балаціруюцца:

#### У АБЛАСНЫ САВЕТ

**МАЛЕЕВА Р. В.**, беларуска, беспартыйная, 1933 года нараджэння, настаўніца Гомельскай СШ № 26 — вылучана па Авіяцыйнай выбарчай акрузе № 7.

#### У ГАРАДСКІ САВЕТ

**ГРЫШАНАЎ А. М.**, беларус, член ВЛКСМ, 1952 года нараджэння, студэнт першага курса Гомельскага дзяржаўнага універсітэта — вылучан па выбарчай акрузе № 47.

**АЎСЯНКОВА В. В.**, беларуска, член ВЛКСМ, 1949 года нараджэння, рабочая пладовагародніннага завода — вылучана па выбарчай акрузе № 48.

**ЗЫБЛЕВА К. А.**, беларуска, беспартыйная, 1942 года нараджэння, брыгадзір брыгады свярлільшчыц прэсава-механічнага цэха завода «Электраапаратура» — вылучана па выбарчай акрузе № 49.

**ХАРКОВА В. В.**, беларуска, беспартыйная, 1939 года нараджэння, брыгадзір глазіроўшчыкаў Гомельскага кандытарскага аб'яднання «Спартак» — вылучана па выбарчай акрузе № 50.

**ПРОТЧАНКА Л. Р.**, беларуска, беспартыйная, 1940 года нараджэння, працуе ў Гомельскім кандытарскім аб'яднанні «Спартак» — вылучана па выбарчай акрузе № 51.

#### У ЧЫГУНАЧНЫ РАЁННЫ САВЕТ

**ДРАЗДОВА А. Ц.**, беларуска, беспартыйная, 1932 года нараджэння, працуе ў Гомельскім кандытарскім аб'яднанні «Спартак» — вылучана па выбарчай акрузе № 64.

**ЛЯВОНАВА М. І.**, беларуска, член ВЛКСМ, 1952 года нараджэння, працуе ў Гомельскім рэзерве праваднікоў — вылучана па выбарчай акрузе № 65.

**АЛЕНІН У. У.**, беларус, беспартыйны, 1945 года нараджэння, шафёр спецаўтабазы Гомельскага аб'яднанага авіяатрада — вылучан па выбарчай акрузе № 66.

**БАБАРЫКА Т. У.**, беларуска, беспартыйная, 1939 года нараджэння, маляр завода «Электраапаратура» — вылучана па выбарчай акрузе № 67.

**МАТРУНЧЫК Ф. А.**, беларус, член КПСС, 1925 года нараджэння, народны суддзя народнага суда Чыгуначнага раёна г. Гомеля — вылучан па выбарчай акрузе № 68.

**КАРОЎКІН П. П.**, беларус, беспартыйны, 1939 года нараджэння, свярлільшчык на заводзе «Гідрапрывад» — вылучан па выбарчай акрузе № 69.

### ПА ВЫБАРЧАМУ УЧАСТКУ № 13

#### У АБЛАСНЫ САВЕТ

**НАВУЧЫЦЕЛЬ М. В.** — рускі, член КПСС, 1924 года нараджэння, в. а. рэктара Гомельскага дзяржаўнага універсітэта, прарэктар па навуковай рабоце — вылучан па Сартавальный выбарчай акрузе № 8.

#### У ГАРАДСКІ САВЕТ

**СЦЕПАНЦОЎ В. Ц.**, беларус, член КПСС, 1936 года нараджэння, старшыня гарадскога камітэта па фізкультуры і спорту — вылучан па выбарчай акрузе № 55.

**ДАЎГЯЛА М. А.**, беларус, беспартыйны, 1949 года нараджэння, шафёр аўтакалоны 2405 — вылучан па выбарчай акрузе № 56.

**ДЗЕВІСЕНКА Н. С.** — руская, беспартыйная, 1935 года нараджэння, інспектар дзяржстатыстыкі г. Гомеля — вылучана па выбарчай акрузе № 57.

#### У ЧЫГУНАЧНЫ РАЁННЫ САВЕТ

**БЕТАНАВА М. А.**, беларуска, член КПСС, 1925 года нараджэння, настаўніца Гомельскай СШ № 12 — вылучана па выбарчай акрузе № 74.

**ПАЎЛАЎ Я. І.**, беларус, член КПСС, 1932 года нараджэння, сакратар Чыгуначнага РК КПБ — вылучан па выбарчай акрузе № 75.

**ТРАЦЭЎСКАЯ Т. П.**, беларуска, член КПСС, 1927 года нараджэння, прарэктар Гомельскага дзяржаўнага універсітэта па завочнаму навучанню — вылучана па выбарчай акрузе № 76.

**ДЗЯМ'ЯНЕНКА Н. М.**, беларуска, беспартыйная, 1937 года нараджэння, урач 6-й гарадской паліклінікі — вылучана па выбарчай акрузе № 77.

**ТАВАРЫШЫ! У дзень выбараў у актавай зале галоўнага корпуса Гомельскага дзяржаўнага універсітэта сіламі вакальна-інструментальнага ансамбля «Радзімічы» для вас будзе паказан канцэрт мастацкай самадзейнасці. Будуць таксама дэманстравацца кінафільмы.**

## ІДУЦЬ ДЗЯРЖАЎНЫЯ ЭКЗАМЕНЫ

# СПАДАРОЖНАГА ВЕТРУ, РАБЯТЫ!

### РЭПАРТАЖ

Трэці вучэбны корпус. Геалагічны факультэт. Цішыня.

Аўдыторыя № 220. Засядае дзяржаўная камісія — ідзе абарона дыпломных праектаў. За кафедрай — хударлявы малады чалавек. Роўна і хутка вядзе ён свой даклад. Аргументавана падмацоўвае ўласныя вывады значным фактычным і графічным матэрыялам.

Пяцікурснік Леанід Гуліс расказвае аб інжынерна-геалагічных умовах будаўніцтва кар'ера на ўчастку Далёказаходні ў Казахстане.

Лёня заканчвае сваё выступленне. Члены дзяржаўнай камісіі задаюць некалькі пытанняў, на якія выпускнік дае дакладныя адказы. Зачытваюцца рэцэнзія і водгук навуковага кіраўніка.

— Работа студэнта Гуліса сведчыць аб добрасумленным вывучэнні апублікаванай і фондавай літаратуры. Ацэнкі і рэкамендацыі па інжынерна-геалагічных пытаннях грунтуюцца на апрацоўцы значнага фактычнага матэрыялу, — адзначае начальнік геалагічнага аддзела аб'яднання «Беларуснафта» А. Філіпаў. — Малады спецыяліст падышоў комплексна да распрацоўкі месцанараджэння. Яго рэкамендацыі эканамічна мэтазгодны, і іх належыць рэкамендаваць да прамысловага ўкаранення.

— Леанід даў поўную геалагічную характарыстыку ўнікальнага па свайму значэнню месцанараджэння, абагульніў інжынерна-геалагічныя даныя, — гаворыць навуковы кіраўнік дацэнт А. Кудэнка. — Дыпломны праект базіруецца на асабістых назіраннях у перыяд вытворчай практыкі і даных, атрыманых у час работы па гаспадарча-дагаворнай тэме. Гуліс апублікаваў сваё даследаванне па методыцы карціравання ва ўмовах вывучаемага месцанараджэння.

Гутару з членам дзяржаўнай камісіі прафесарам В. Герасімавым.

— Перад намі прайшлі ўжо 11 студэнтаў другога выпуску геалагічнага факультэта ГДУ, — расказвае Васіль Герасімавіч. — Добрыя веды паказваюць юнакі і дзяўчаты. Вышэйшымі баламі ацэнены адказы Уладзіміра Макарука, Васіля Маркача, якія атрымаюць дыпломы з адзнакай, Ігара Баланюка і Аркадзя Гардзеева. Трывалыя веды ў нашых выхаванцаў.

— Радуе геаграфія дыпломных даследаванняў, — уступае ў размову дэкан дацэнт Ю. Хадакоўскі. — Розныя раёны Беларусі, Украіны, Казахстана...



Задаволен падрыхтоўкай выпускнікоў старшыня дзяржаўнай камісіі кандыдат геолага-мінералагічных навук, начальнік тэматычнай партыі аб'яднання «Беларуснафта» Ул. Макаравіч:

— Уражанні добрыя. Адчуваецца грунтоўная тэарэтычная падрыхтоўка, аб якой сведчаць работы і даклады дыпломнікаў.

Год назад краіна атрымала першых 35 выпускнікоў-геолагаў з дыпломамі Гомельскага дзяржаўнага універсітэта. Сёлета да іх далучыцца яшчэ 44 разведчыкі нетраў.

І прабачаць мяне ў неарыгінальнасці — няхай шчасціць вам, рабяты, на цяжкай і захапляючай дарозе пошукаў. Спадарожнага ветру, рамантыкі і непаседы!

**Р. ПІНСКІ.**

**НА ЗДЫМКУ: Леанід Гуліс расказвае перад дзяржаўнай камісіяй аб праблемах, якія ён распрацоўваў у сваёй дыпломнай рабоце.**

### ДА ДНЯ МЕДЫЦЫНСКАГА РАБОТНІКА

# НА ВАРЦЕ ЗДАРОЎЯ

Заўтра традыцыйнае свята — Дзень медыцынскага работніка. У гэты дзень савецкі народ ушаноўвае самааддану працу людзей у белых халатах, вартавых нашага здароўя.

У Савецкай краіне праяўляюцца вялікія клопаты аб здароўі чалавека-працаўніка — багацці сацыялістычнага грамадства, у якім мы жывём. За апошнія дзесяцігоддзі павялічылася сярэдняя працягласць жыцця ў СССР. Цяпер яна роўная 70 гадам. Гэта адбылося дзякуючы нястомнай працы шматлікага атрада медыкаў і росту матэрыяльнага ўзроўню жыцця насельніцтва.

Многія складаныя задачы стаяць перад медыцынскімі работнікамі. Прагрэс чалавецтва, павелічэнне патоку інфармацыі вымушае людзей многа часу праводзіць за іх апрацоўкай, у выніку гэтага чалавек усё менш часу займаецца фізічнай працай. Таму знаходжанне найбольш аптымальных рэжымаў разумовай і фізічнай працы становіцца першачарговай задачай медыкаў.

Агульнавядома, што фізічныя практыкаванні, іх комплексы паляпшаюць абмен рэчываў у арганізме, ствараюць лепшыя ўмовы для работы сардэчна-сасудзістай сістэмы і мозгу. Рэгулярныя фізічныя нагрузкі садзейнічаюць пастаяннаму захаванню тонусу сардэчна-сасудзістай і нервовай сістэмы.

Разам з усім шматлікім атрадам савецкіх медыкаў свой уклад у работу па ахове здароўя людзей уносяць медыцынскія работнікі нашага універсітэта. У нас працуюць два прафесары, чатыры дацэнты, сем кандыдатаў медыцынскіх навук, чатыры ўрачы і два фельчары. Вялікую педагагічную і грамадскую работу па падрыхтоўцы сярэдніх медыцынскіх кадраў праводзяць супрацоўнікі кафедры грамадзянскай абароны, якую узначальвае дацэнт Ф. Ф. Ганчэль.

Шмат клопатаў аб здароўі супрацоўнікаў і студэнтаў ГДУ праяўляюць работнікі медпункта універсітэта. Больш як 15 гадоў яго ўзначальвае кваліфікаваны спецыяліст і чулы чалавек Э. І. Дадзіёмава. Заўсёды гатовы прыйсці на дапамогу сваім пацыентам зубны ўрач Т. Г. Мітрафанава, фельчары Е. Ф. Сляпухіна і Н. Марчанка.

Напярэдадні традыцыйнага свята хочацца пажадаць усім людзям у белых халатах поспехаў у іх высакароднай працы.

**А. КАЛУГІН,**
загадчык кафедры фізіялогіі спорту і спартыўнай медыцыны, прафесар.

ДА ВЫНІКАЎ АГЛЯДУ ТЭХНІЧНАЙ ТВОРЧАСЦІ СТУДЭНТАЎ

# ВЫСТАЎКА ЗАСВЕДЧЫЛА

З 1 па 10 чэрвеня паспяхова прайшла першая выстаўка навукова-тэхнічнай творчасці студэнтаў універсітэта.

На выстаўку было прадстаўлена звыш 30 прыбораў, стэндаў, макетаў і серый вучэбна-наглядных дапаможнікаў, выробленых у навуковых гуртках СНТ факультэтаў. Асноўная рыса, якая іх адрознівае, гэта тое, што ўсе яны зроблены ў час вучэбнага працэсу, і павінны паляпшаць наглядны бок нашых лекцый, практычных і лабараторных заняткаў, павышаць іх навукова-метадычны ўзровень. Другая важная іх якасць, на наш погляд, заключаецца ў тым, што ўсе гэтыя прыборы зроблены ў перыяд бурнага развіцця вучэбна-лабараторнай базы універсітэта.

Выстаўка паказала, што ў нас адбыўся прыкметны зрух у навукова-тэхнічнай творчасці, актывізавалася дзейнасць НДРС.

Нашы студэнты прымаюць удзел у навуковых канферэнцыях рознага профілю і маштабу. Сёлета імі апублікавана 12 навуковых работ, шэраг матэрыялаў здадзен у друк. У Камітэт па справах вынаходніцтваў і адкрыццяў накіравана некалькі заявак на вынаходніцтвы, якія падрыхтаваны студэнтамі ў сааўтарстве з выкладчыкамі.

Што ж паказала першая выстаўка? Работы студэнтаў факультэта фізічнага выхавання адрозніваюцца добрым знешнім выглядам і, галоўнае, сваім зместам. На кафедры фізіялогіі спорту і спартыўнай медыцыны пад кіраўніцтвам прафесара А. Калугіна і старшага выкладчыка В. Падасінава пачата вялікая работа па тэхнічнаму ўзбраенню трэніровак у розных відах спорту, даследаванню ўздзеяння разнастайных нагрузак і рэжымаў трэніровак на рост майстэрства спартсменаў.

Вялікую дапамогу баскетбалістам акажа «Трэнаж для даследавання зрокава-рухальнай рэакцыі спартсменаў-ігравікоў (баскетбалістаў)», выраблены студэнтам 4-га курса Уладзіславам Барковым. Асаблівасцю трэнажа з'яўляецца тое, што ў ім прымяняюцца монахраматычныя аб'екты раздражненняў — макеты баскетбольных мячоў, якія маюць шэраг пераваг перад светавымі раздражняльнікамі. Ён дазваляе здзяйсняць вывучэнне часовай структуры прыёмаў гульні — перадач мяча ў баскетболе.

З дапамогай трэнажа рэгіструецца час латэнтнага перыяду простай і дыферэнцыраванай рэакцыі на зрокавы сігнал, час выканання перадачы мяча дзвюма рукамі ад грудзей і адной рукой ад пляча. Запіс праводзіцца на спецыяльна сканструяваным аўтарам самапісцу.

Велаэргаграф, які зрабіў трэцякурснік факультэта фізвыхавання Мікалай Рухля, прызначан для графічнай рэгістрацыі затрачанай работы спартсменаў з любой зададзенай нагрузкай.

Выклікала цікавасць яшчэ адна работа У. Баркова — «Фізіялагічная ўстаноўка для вызначэння латэнтнага перыяду зрокава-маторнай рэакцыі»,—якая можа быць выкарыстана для вызначэння скрытага (латэнтнага) перыяду зрокава-маторнай рэакцыі. Работа Баркова мае шэраг пераваг над існуючымі прыборамі падобнага прызначэння.

Унікальныя экспанаты прадставілі студэнты гуртка, які працуе пры кафедры батанікі біёлага-глебавага факультэта. У іх экспанатах мы сустракаемся з найбольш поўнымі калекцыямі трутневых грыбоў, водарасцей і раслін, якія студэнты сабралі на Гомельшчыне (на Палессі ў Прыпяцкім запаведніку). Экспанаты прыцягнулі ўвагу ўсіх, хто наведвае наш універсітэт.

27 прыбораў, канструкцыі якіх яшчэ не асвоены прамысловасцю, прадставілі гурткі кафедраў тэарэтычнай і агульнай фізікі. Яны выкананы пад кіраўніцтвам старшага выкладчыка М. Кузея, асістэнта А. Малашчанкі і аўтара гэтых радкоў.

Трэба адзначыць унікальнасць такіх прыбораў, як «Электронны школьны лічыльнік-секундамер» студэнта В. Лапіцкага, «Генератар электрычных хістанняў са зваротнай трансфарматарнай сувяззю» М. Шумскага, Н. Даніленкі і В. Панцялеева, «Электронны камутатар» М. Бяляева, «Панель для дэманстрацыі на экране асцылографа фазавых суадносін паміж токам і напружаннем у цэпах нізкай частаты» А. Казакова, «Генератар электрычных затухаючых хістанняў» А. Краўчанкі і В. Казлова і іншыя, выробленыя ў лабараторыі тэхнікі школьнага фізічнага эксперымента пад кіраўніцтвам Міхаіла Сцяпанавіча Кузея.

Падводзячы вынікі выстаўкі, неабходна адзначыць, што навукова-тэхнічная творчасць студэнтаў універсітэта ўпэўнена набірае сілу. На выстаўцы дэманстраваліся далёка не ўсе прыборы, выробленыя членамі СНТ. У прыватнасці, не былі прадстаўлены арыгінальныя прыборы па фізіцы цвёрдага цела, радыёфізіцы, атамнай і ядзернай фізіцы, таму што ў гэты час яны былі заняты ў лабараторным практыкуме фізічнага факультэта, служылі стэндам пры выкананні курсавых і дыпломных работ.

Рашэннем аргкамітэта выстаўкі першае месца сярод факультэтаў заняў фізічны факультэт, другое — факультэт фізвыхавання, трэцяе — біёлага-глебавы факультэт.

Прызавыя месцы паміж кафедрамі вызначыліся наступным чынам:

I месца — кафедра тэарэтычнай фізікі;

II месца — кафедра фізіялогіі спорту і спартыўнай медыцыны;

III месца падзялілі кафедра батанікі і кафедра агульнай фізікі.

Аргкамітэт адзначыў актыўны ўдзел ў развіцці навукова-тэхнічнай творчасці студэнтаў і кваліфікаванае кіраўніцтва прадстаўленымі на выстаўку работамі прафесара А. С. Калугіна, старшых выкладчыкаў М. С. Кузея, В. Д. Падасінава і А. І. Сінюка, прафесара А. С. Паламарчука, асістэнта А. Г. Малашчанкі.

У выніку конкурсу асобных прыбораў прызавыя месцы размеркаваны наступным чынам:

I месца: а) трэнаж для даследавання зрокава-рухальнай рэакцыі спартсменаў-ігравікоў (баскетбалістаў). Аўтар — У. Баркоў; б) серыя прыбораў «Вывучэнне ўласцівасцей электронаў». Аўтары — студэнты фізічнага факультэта Я. Бейлін (3 курс), В. Сцепанец (3 курс), А. Канопліч (3 курс), В. Юркоў (1 курс);

II месца: а) Велаэргаграф. Аўтар — студэнт 3 курса факультэта фізвыхавання М. Рухля; б) серыя вучэбна-наглядных дапаможнікаў па ахове прыроды і батаніцы (на матэрыялах Палесся і Прыпяцкага запаведніка). Аўтар — гурток СНТ кафедры батанікі;

III месца: а) фізіялагічная ўстаноўка для вызначэння латэнтнага перыяду зрокава-маторнай рэакцыі. Аўтар — студэнт 4 курса факультэта фізвыхавання У. Баркоў; б) лагарыфмічны інтэнсіметр. Аўтары — студэнты 1 курса фізічнага факультэта М. Шаўлоўскі, В. Юркоў, А. Суравегін; в) лабараторны стэнд для даследавання ўласцівасцей лічыльнікаў Гейгера-Мюлера. Аўтар — студэнт 3 курса фізічнага факультэта В. Брыт.

Усе пераможцы першай універсітэцкай выстаўкі навукова-тэхнічнай творчасці студэнтаў прадстаўлены да ўзнагароджання Ганаровымі граматамі рэктарата і савета СНТ універсітэта і прэміямі.

Выстаўка паказала, што геалагічны, гісторыка-філалагічны, эканамічны і механіка-матэматычны факультэты мала ўвагі ўдзяляюць развіццю навукова-тэхнічнай творчасці студэнтаў.

Зроблены першыя крокі ў цяжкім, але вельмі патрэбным напрамку дзейнасці калектыву універсітэта.

**А. СІНЮК,**
**старшыня аргкамітэта першай выстаўкі навукова-тэхнічнай творчасці студэнтаў універсітэта, старшы выкладчык.**

Прафсаюзнае ЖЫЦЦЁ

# ПАВЫШАЦЬ РОЛЮ СТУДСАВЕТАЎ

НЕ ТАК даўно закончылася справаздачна-выбарная кампанія ў студэнцкіх інтэрнатах універсітэта. Студэнцкія саветы — органы студэнцкага самакіравання — давалі справаздачу аб сваёй рабоце. Адбылася шырокая размова пра тое, што зроблена членамі савета на працягу навучальнага года ў арганізацыі дзяжурстваў, навядзенні высокай санітарыі і парадку ў пакоях, у правядзенні культурнага адпачынку і многіх іншых мерапрыемстваў. Гэтыя і многія іншыя пытанні знайшлі шырокі водгук як з боку дакладчыкаў, так і выступаўшых у спрэчках.

На справаздачна-выбарных сходах адзначалася мэтазгоднасць і ў далейшым праводзіць агляды-конкурсы на лепшы інтэрнат, паверх, пакой. Сацыялістычнае спаборніцтва ў гэтай справе дысцыплінуе студэнтаў, прымушае іх сачыць за парадкам, як ва ўласным доме. Нездарма ж цяпер кажуць: «Інтэрнат — твой дом».

У бягучым навучальным годзе ў інтэрнатах больш арганізавана вядзецца дзяжурства, узмоцнена барацьба з парушальнікамі сацыялістычнага агульнажыцця. Студсаветы наладзілі больш дзелавую сувязь з прафкомам універсітэта. Разнастайнейшай стала выхаваўчая і агульна-масавая работа.

Шмат пастараліся студэнты. Імі многае зроблена па афармленню Ленінскіх пакояў, па добраўпарадкаванню свайго жылля і інтэрнатаў у цэлым, прылягаючых тэрыторый.

Аднак у рабоце студсаветаў назіралася яшчэ і нямала недахопаў. Многія студэнты яшчэ не праніkліся пачуццём глыбокай адказнасці за захаванне сацыялістычнай маёмасці, з непавагай адносяцца да працы прыбіральшчыц і абслугоўваючага персаналу. Асобныя студэнты, асабліва з факультэта фізічнага выхавання, па-ранейшаму вызначаюцца грубасцю, не прытрымліваюцца ўстаноўленага у інтэрнаце распарадку.

Студэнтаў сваіх груп рэдка наведвалі куратары. Выхаваўчая работа вялася на нізкім узроўні.

Студэнцкія саветы не праяўлялі настойлівасці ў стварэнні нармальных бытавых умоў для студэнтаў. А адміністрацыйна-гаспадарчая частка не заўсёды ўважліва ўнікала ва ўсе нявырашаныя праблемы.

Жыццё патрабуе прыкметна павысіць ролю студэнцкіх саветаў ва ўсіх аспектах. У будучым яны абавязаны яшчэ больш актыўна весці барацьбу за чысціню і парадак у інтэрнатах, захаванне ўсімі жыхарамі правіл унутранага распарадку. Трэба больш шырока выкарыстоўваць усемагчымыя формы ў арганізацыі культурнага і карыснага адпачынку, асабліва ў выхадныя дні.

Уся работа студсаветаў павінна быць падпарадкавана мэце паляпшэння ўсяго вучэбнага і выхаваўчага працэсу нашых студэнтаў.

**М. БАЙДА,**
**старшыня прафкома.**

НОВЫЯ ПАСТУПЛЕННІ Ў БІБЛІЯТЭКУ

Кніжная паліца

**Дзюбайла П. К.** Праблемы стылю ў сучаснай беларускай прозе. Мн., «Навука і тэхніка», 1973, 176 стар.

У кнізе вызначаюцца асноўныя стылявыя напрамкі плыні ў сучаснай беларускай «вялікай», прозе, даследуецца індывідуальны стыль многіх вядомых празаікаў— І. Мележа, І. Шамякіна, Я. Брыля, В. Быкава, М. Лобана, І. Навуменкі, А. Кулакоўскага, І. Пташнікава, А. Карпюка, У. Караткевіча, Б. Сачанкі, І. Чыгрынава і інш.

**Рурыкаў Б.** Аб рускіх класіках. М., 1972, 528 стар.

У гэтым зборніку прадстаўлены ўсе лепшыя працы пра Чарнышэўскага, Талстога, Горкага. Чытач пазнаёміцца з артыкуламі, прысвечанымі ўспамінам сучаснікаў аб Дастаеўскім, з матэрыяламі аб апошніх гадах жыцця вялікага пісьменніка. Завяршае зборнік артыкул «Традыцыі А. Горкага і сучасная літаратура».

НА КОНКУРС «ФОТА-73»



НАДВЯЧОРКАМ КАЛЯ ЦЫРКА.

Фота В. Цярэшчанкі.

